*Л.У.ЛЯХОВІЧ*

# КУЛЬТУРНЫЯ СУВЯЗІ ПАМІЖ ФРАНЦЫЯЙ І БЕЛАРУССЮ Ў ПОСТСАВЕЦКІ ЧАС

У 90-я гг. XX ст. распаўся СССР, скасавалася сістэма Варшаўскага дагавора, узніклі новыя незалежныя дзяржавы. Гэты працэс суправаджаўся эканамічнымі крызісамі, ідэалагічнай ломкай і сацыяльнымі зрухамі. У дадзеных умовах найбольш пацярпелі эканамічныя і палітычныя сувязі паміж дзяржавамі.

Стварэнне СНД і абвяшчэнне суверэнітэту былымі рэспублікамі СССР было дастаткова насцярожана ўспрынята заходнімі дзяржавамі, у тым ліку Францыяй. Аднак менавіта Францыя была першай заходняй дзяржавай, якую наведаў у красавіку 1992 г. Старшыня Вярхоўнага Савета РБ С.Шушкевіч. Гэта была першая заява Беларусі аб сабе ў далёкім замежжы. На той час найбольш складанымі і актуальнымі былі пытанні карэннай палітычнай перагрупоўкі ў Еўропе, лёсу ядзернай зброі былога СССР, эканамічнага і палітычнага крызісу на постсавецкай прасторы. Праблемы культуры, навукі, гуманітарных кантактаў былі нібыта другараднымі, аднак менавіта гэтыя кірункі зносін аказаліся найбольш стабільнымі.

У пачатку 1993 г. Камітэт Міністраў Савета Еўропы прапанаваў Беларусі далучыцца да Еўрапейскай культурнай канвенцыі, расцэньваючы гэта як першы крок на шляху інтэграцыі Беларусі ў адпаведныя еўрапейскія структуры.

У пачатку 1993 г. у Беларусі была зарэгістравана міжнародная асацыяцыя “Беларусь–Францыя”, галоўнай мэтай якой стала наладжванне цесных сувязей паміж краінамі ў галіне эканомікі і культуры. У рэчышчы гэтага адбыўся першы візіт беларускіх прадстаўнікоў названай асацыяцыі ў Парыж і наладжаны кантакты з беларускай дыяспарай у Францыі і яе арганізацыяй “Хаўрус” [1].

4 снежня 1995 г. было прынята рашэнне аб стварэнні ў Францыі Нацыянальнай асацыяцыі “Францыя–Беларусь” (НАФБ), якая пазней атрымала назву “Беларускія перспектывы”, а потым быў заснаваны аднайменны інфармацыйны бюлетэнь. На працягу 1995–1996 гг. пры ўдзеле НАФБ адбыліся дні Беларусі ў Парыжы, Міжнародны кангрэс беларусістаў у Мінску і інш.

На працягу 90-х гг., нягледзячы на эканамічныя цяжкасці, беларускім артыстам усё ж удавалася заяўляць аб сабе ў Францыі. Так, у 1992 г. фальклорны ансамбль “Брэстчанка” выступаў на Міжнародным фестывалі фальклорных мастацтваў у Бургундыі. У 1993 г. у Францыі прайшлі гастролі пінскага ансамбля “Палессе”, які быў запрошаны на Міжнародны фестываль фальклорнай харэаграфіі.

Французскія пакупнікі змаглі ацаніць вырабы з беларускага фарфору. У французскім горадзе Клермон-Феран, пабрацíме Гомеля, быў адкрыты магазін “Калінка” з вырабамі беларускага фарфору Добрушскай вытворчай фірмы. У 1994 г. Масква і Парыж убачылі выставу “Народнае мастацтва Палесся”, якая прайшла ў кантэксце міжнароднай акцыі “ЮНЕСКА–Чарнобыль” [2]. У гэтым жа годзе ў Беларусь былі накіраваны знойдзеныя ў архівах Нацыянальнай кансерваторыі Францыі копіі нот вальсаў Напалеона Орды (1807–1883), беларускага графіка і кампазітара. Ажыццяўлялася таксама пошук у Францыі твораў Ф.Міладоўскага (1819–1889), беларускага кампазітара і піяніста, які пасля 1861 г. жыў у Францыі [3].

Актывізаваўся міжнародны кніжны абмен, яго з беларускага боку ажыццяўляла Нацыянальная бібліятэка. Калі ў 1985 г. у яе было 170 замежных партнёраў, то ў пачатку 1997 г. – 297 у 46 краінах свету, і Францыя займала чацвёртае месца сярод партнёраў Беларусі пасля Германіі, ЗША і Польшчы [4].

Вялікая “артыстычная прысутнасць” Беларусі ў Францыі назіралася ў 1995 г. Гэта гастролі сімфанічнага аркестра “Калегіум музікум”, канцэрты сімфанічнага аркестра Беларускай акадэміі музыкі, выстава ікон з запаснікаў АН Беларусі. З гастролямі ў Францыі пабывала трупа тэатра імя Я.Купалы. У тым жа годзе балетная трупа тэатра оперы Беларусі давала гастролі ў Францыі, і гэта была яе чацвёртая паездка. На французскай сцэне былі паказаны “Лебядзінае возера”, “Рамэо і Джульета”, “Спартак”, “Жызель”, “Шчаўкунчык”. Выступленні адбыліся ў такіх гарадах, як Парыж, Грэнобль, Каны, Перпін’ян [5].

У Парыжскім музеі сучаснага мастацтва праходзіла выстава “Шагал: рускія гады (1907–1922)”, а годам раней быў арганізаваны І Міжнародны пленэр прысвечаны Шагалу ў Віцебску [6].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адной з найбольш яскравых падзей першай паловы 90-х гг. стала прысутнасць на "Славянскім базары" ў 1994 г. знакамітага французскага кампазітара М.Леграна, які ўзначаліў журы ў Віцебску.

У першай палове 90-х гг. прысутнасць французскіх артыстаў і дзеячаў мастацтва ў Беларусі была эпізадычнай, больш маштабнымі культурныя сувязі сталі ў другой палове 90-х гг.

У 1996 г. у Парыжы прызам "Бенуа дэ ля данс", прэстыж якога можна параўнаць з кінематаграфічным "Оскарам", былі адзначаны беларускі балет "Страсці" ("Рагнеда") і балетмайстар В.Елізар'еў. У тым жа годзе пачаўся сапраўдны "французскі сезон" у Мінску. Гэта канцэрты Э.ле Сажа (фартэпіяна) і П.Меера (кларнет), балет у пастаноўцы Нацыянальнага харэаграфічнага цэнтра г. Тур, рэтраспектыва фільмаў студыі "Патэ" і інш. Падрыхтоўка і правядзенне гэтых мерапрыемстваў сталі магчымымі дзякуючы Міністэрству культуры Беларусі, Дзяржаўнаму харэаграфічнаму вучылішчу Беларусі, Беларускай асацыяцыі кінаклубаў і Пасольству Францыі [7].

Дынамічны культурны абмен працягваецца і зараз. Асабліва патрэбна адзначыць тэатральнае супрацоўніцтва паміж студэнтамі, у дадзеным выпадку Акадэміі мастацтваў г. Мінска і Цэнтра Casal-Curial Парыжа-19. Яшчэ ў 1994 г. адзін з французскіх студэнтаў Ф.Карэй арганізаваў асацыяцыю "Да заўтра, вясна!", а потым быў наладжаны франка-беларускі абмен [8]. Ён прадугледжваў стажыроўкі, сустрэчы паміж тэатральнымі трупамі і супрацоўніцтва з тэатрам "Esprit de Sel", які быў арганізаваны ў Парыжы ў 1991 г.

У 1997 г. адбыліся II Міжнародны пленэр у Віцебску і дні, прысвечаныя М.Шагалу. У Мінску прайшла выстава работ М.Шагала міжземнаморскага перыяду яго творчасці. Гэта была першая на радзіме М.Шагала выстаўка яго твораў з калекцыі музея ў Ніццы і прыватных збораў [9].

Беларускія дзеячы культуры ўсё больш упэўнена заваёўвалі французскую сцэну. У 1997 г. у Парыжы адбыўся канцэрт Дзяржаўнага камернага аркестра Беларусі, некалькі раней у г. Туры выступаў мужчынскі хор "Унія", які назвалі "сенсацыяй з Беларусі" [10].

У 1998 г. у Мінску адбыліся канцэрты П.Каас. Яны атрымалі шырокі рэзананс у прэсе. Выступленне П.Каас адбылося ў рамках праграмы "Тур дэ шарм", з якой спявачка гастралявала по краінах Еўропы. У тым жа годзе ў Мінску пачалася чарговая франка-беларуская музычная вясна. Падзеяй стаў дэбют інтэрнацыянальнага дуэта – Ж.Перно (віяланчэль) і Ц.Сергіені (фартэпіяна), які выканаў творы К.Дэбюсі, Г.Фарэ, А.Месіяна, С.Рахманінава. Акрамя таго, выступалі І.Карсанці (альт), Л.Дабражынец (скрыпка), Ю.Гільдзюк (фартэпіяна) з творамі французскіх кампазітараў [11]. У наступныя гады гастролі Ж.Перно, Ж.Дзюкро, І.Карсанці сталі традыцыйнымі для беларускай публікі. Яны адбываюцца ў рамках падпісанага ў чэрвені 1998 г. пагаднення паміж кансерваторыяй імя Г.Шарпанцье 18-й акругі Парыжа і Дзяржаўным музычным каледжам Беларусі.

У сувязі са 100-годдзем вядомай французскай кінакампаніі "Гамон" Пасольства Францыі і беларуская арганізацыя "Кінаклуб" падрыхтавалі рэтраспектыву яе фільмаў у нашай сталіцы. У той жа час былі арганізаваны дэманстрацыя фільмаў Саша Гітры і кінапраграма "Час музея", прысвечаная 200-годдзю Луўра [12], а таксама рэтраспектыва лепшых французскіх фільмаў часоў "паэтычнага рэалізму" з Ж.Габэнам у галоўнай ролі.

У пачатку 1998 г. у Мінск прыехаў вядомы французскі харэограф Ф.Каэн. Галоўная мэта яго прыезду – падпісанне пагадненняў аб супрацоўніцтве паміж Беларускім дзяржаўным харэаграфічным каледжам і факультэтам харэаграфіі Ліёнскай нацыянальнай кансерваторыі музыкі. Пагадненне прадугледжвала абмен студэнтамі і педагогамі, а таксама стварэнне сумесных мастацкіх праектаў [13]. Сярод мерапрыемстваў у дадзеным рэчышчы вяршыняй была пастаноўка ў ліпені 1999 г. на сцэне Нацыянальнага Вялікага тэатра оперы і балета аднаактавай балетнай пастаноўкі "Сон у летнюю ноч". Праект быў рэалізаваны французскім харэографам Ф.Каэнам у супрацоўніцтве з В.Елізар'евым па сюжэце Шэкспіра на музыку Мендэльсона. З нагоды гэтага пасол Францыі Б.Фасье адзначыў: "Паўтара года таму назад немагчыма было ўявіць, што гэта адбудзецца на сцэне Вялікага тэатра" [14].

У сувязі з юбілеем А.С.Пушкіна Мінская абласная бібліятэка атрымала ў падарунак ад Пасольства Францыі каля 150 мастацкіх выданняў кніг па філасофіі, сацыялогіі, мастацтве лепшых французскіх аўтараў XX ст. Беларуская арганізацыя "Кінаклуб" і Пасольства Францыі ў чарговы раз падрыхтавалі серыю паказаў "Мастацтва і эсэ", дзе ў 25 кіналентах былі аб'яднаныя нарысы аб мастаках і іх творах [13].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У канцы 1998 г. кніга С.Алексіевіч “Чарнобыльская малітва: хроніка будучага” была выдадзена ў Францыі і ўжо ў лютым 1999 г. апынулася ў спіску бестселераў. Акрамя таго, на працягу васьмі гадоў у Францыі выходзілі “Зачараваныя смерцю” і “Цынкавыя хлопчыкі”. Пастаноўкі “Цынкавых хлопчыкаў” прайшлі ў тэатрах Ліёна, Марселя, Парыжа і на тэатральным фестывалі ў Авіньёне [15].

17 мая 2000 г. Мінск у рамках сусветнага тура зноў наведала П.Каас. 13 жніўня таго ж года на Беларускім тэлебачанні пачалася трансляцыя перадач Міжнароднага французскага канала. У кастрычніку–лістападзе 2000 г. у Мінску прайшла чарговая рэтраспектыва французскага кіно “Французскае каханне: гульня, разлік, поспех”, якая з’явілася першай акцыяй новага аташэ па культуры Пасольства Францыі К.Маршэлідона.

У пачатку трэцяга тысячагоддзя захоўваецца характар трывалых кантактаў. 10 кастрычніка 2001 г. у Мінску са сваім шоу “Страсці па Рышару” выступіў вядомы французскі кінаакцёр П.Рышар.

У жніўні 2002 г. артысты беларускага харэаграфічнага ансамбля “Вязынка” прымалі ўдзел у 47-м фальклорным фестывалі, які адбыўся ў г.Радэс. У кастрычніку 2002 г. у Беларусі праходзілі чарговыя дні Францыі. Жаночы хор "Талака" ў чэрвені 2003 г. прыняў удзел у Міжнародным фестывалі універсітэцкай музыкі ў Бельфоры.

Прыметнай падзеяй у лістападзе 2003 г. з’явілася адкрыццё выставы, прысвечанай 150-годдзю з дня нараджэння Вінсента Ван Гога. Выстава была арганізавана намаганнямі міжнароднага грамадскага аб’яднання мастакоў і мастацтвазнаўцаў “Майстар” пры садзеянні пасольстваў Францыі, ЗША, Дзіцячага фонду ААН і Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Мінскія гледачы пабачылі творы мастакоў з Беларусі, Расіі, ЗША, Італіі, Францыі, Польшчы, Літвы, Чэхіі, Балгарыі; быў таксама паказаны фільм французскіх кінематаграфістаў, прысвечаны жыццю і творчасці Ван Гога. Акрамя таго, прайшла дабрачынная акцыя з продажам мастацкіх твораў.

У пачатку мінулага года з нагоды Ражства Хрыстова Прэзідэнт Беларусі А.Лукашэнка ўручыў ордэн Францыска Скарыны вядомаму французскаму куцюр'е і мецэнату П'еру Кардэну – паслу добрай волі ЮНЕСКА. Прэзідэнт Беларусі выказаў падзяку П.Кардэну за дапамогу нашай краіне ў пераадоленні наступстваў чарнобыльскай катастрофы, а таксама за прапаганду беларускай культуры ў Францыі.

Сапраўды, П'ер Кардэн арганізаваў фінансавую дапамогу ў рэалізацыі праграмы "ЮНЕСКА–Чарнобыль", аказаў садзейнічанне ў будаўніцтве медыцынскіх цэнтраў у пасёлку Аксакаўшчына Мінскага раёна, вёсках Пяршай Валожынскага і Стрэшын Жлобінскага раёнаў.

У ходзе сустрэчы Прэзідэнта краіны і П'ера Кардэна былі абмеркаваны пытанні далейшага супрацоўніцтва. Напрыклад, разглядаецца магчымасць паказу ў г. Мінску музычнага спектакля П.Кардэна "Трыстан і Ізольда". Беларускі бок выказаў зацікаўленасць у стажыроўках спецыялістаў Беларускага цэнтра моды, Нацыянальнай школы прыгажосці ў Цэнтры П'ера Кардэна ў Парыжы.

Такім чынам, незалежна ад складанасцей міжнароднага становішча, а таксама эканамічнай і палітычнай кан’юнктуры культурныя запатрабаванні людзей і чалавечыя кантакты аказваюцца найбольш трывалымі ў зменлівым свеце.


1. *Багдановіч В.* “Я параўноўваў французскія гарады і вёскі з беларускімі” // Літаратура і мастацтва. – 1992. – 17 крас. – С. 3.

2. *Овчаров В.* Москва и Париж увидят искусство Полесья // Советская Белоруссия. – 1994. – 2 апр. – С. 3.

3. *Архіў* Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь, фонд Пастаяннага Прадстаўніцтва БССР пры ЮНЕСКА, воп. 34, пар. №25, папка № 2 (3), арк. 76–79.

4. *Крывашэй Д.* Прысутнасць беларускай культуры ў краінах Цэнтральнай і Заходняй Еўропы ў 1991–1996 гг. // Кантакты і дыялогі. – 1999. – № 5. – С. 5–10.

5. *Фёдарава Т.* Штурм Францыі працягваецца//Літаратура і мастацтва. – 1995. – 29 снеж. – С.11.

6. *Абакумоўская Т.* Віцебск – мой Парыж// Рэспубліка. – 1994. – 5 ліп. – С. 4.

7. *Витковский П.* Французский сезон в Минске// 7 дней. – 1996. – 15 апр. – С. 15.

8. *Symaniec V.* Du théatre biélorussien à Paris// Perspectives biélorussiennes. Bulletin trimestriel d’information sur la Biélorussie. – 1997. – № 6. – P. 7.


РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

9. *Стулова А.* Ее дедушка – Марк Шагал//Советская Белоруссия. – 1997. – 7 июня. – С. 5.
10. *Шумарова Е.* Во Франции их называли “сенсацией из Беларуси”// Народная газета. – 1997. – 6 февр. – С. 4.
11. *Берасцень С.* “...А прачнуцца ў Парыжы” //Літаратура і мастацтва. – 1998. – 13 крас. – С. 3.
12. *Барабаншчыкава В.* Кінапраграма да 200-годдзя Луўра//Літаратура і мастацтва. – 1998. – 24 ліп. – С.10.
13. *Французская* изюминка в белорусской хореографии//Советская Белоруссия. – 1998. – 11 февр. – С. 1.
14. *Маслюкова Л.* В “комедии ошибок” все заканчивается хорошо//Советская Белоруссия. – 1999. – 15 июля. – С. 1, 3.
15. *Шапран С.* Французский триумф Светланы Алексиевич// Белорусская деловая газета. – 1999. – 15 февр. – С. 22.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ